Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 23(571) Аўторак, 16 чэрвеня 1964 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

## Я схіляюся перад гераізмам абаронцаў Брэста

Некалькі дзён таму назад у складзе вялікай групы студэнтаў-іншаземцаў, што навучаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна, я пабываў на экскурсіі ў Брэсцкай крэпасці.

Мы наведалі музей абароны крэпасці, паглядзелі фільм «Цытадэль над Бугам». Мне было цяжка стрымацца, на вачах выступалі слёзы. У сэрцы расла нянавісць да фашыстаў, да іх жорсткасці, бесчалавечнасці.

Я схіляюся перад мужнасцю абаронцаў крэпасці, якія змагаліся да апошняга подыху, праяўлялі такую вернасць і адданасць сваёй Радзіме, на якую здольныя толькі тыя, для каго свабода Радзімы даражэй за жыццё. Я з хваляваннем чытаў надпісы, што, паміраючы, пакінулі на сценах крэпасці яе абаронцы: «Памром, але крэпасць не аддадзім!», «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!»

Я яшчэ раз падумаў, якія бедствы нясе з сабой вайна! Яшчэ больш моцнай стала ў мяне нянавісць да імперыялістаў, якія рыхтуюць новую вайну. Няхай тыя, хто не ведае, што такое вайна, паглядзяць на руіны Брэсцкай крэпасці, на попел ахвяр Бухенвальда і Асвенцыма. Яны зразумеюць, што такое вайна!

Народы Афрыкі і мой кенійскі народ змагаюцца за мір. Усім народам у гэтай барацьбе трэба згуртавацца яшчэ мацней. Няхай жыве мір на Зямлі! НЕ — ВАЙНЕ!

Роберт КЕЙГЕ,
студэнт з Кеніі.

## „Двойка"... з усмешкай

Экзамен па палітычнай эканоміі на трэцім курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры (экзаменатар — Пётр Усцінавіч Грышановіч) толькі пачаўся. У калідоры ўсхвалявана чакаюць сваёй чаргі юнакі і дзяўчаты.

А за дзвярыма строгі (так думаюць студэнты), але зусім справядлівы экзаменатар правярае, наколькі трывалыя веды ў студэнтаў па першаму раздзелу курса палітычнай эканоміі. Білеты вельмі цяжкія, але калі ты рыхтаваўся да экзамену сур'ёзна, то сам «д'ябал не страшны». Адказвае І. Лапкоўская. Вось пытанні яе білета: «1. Умовы рэалізацыі пры простым капіталістычным узнаўленні. 2. Работа Уладзіміра Ільіча Леніна «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму». Дзяўчына адказвае недастаткова дакладна, у некаторых месцах «спатыкаецца» і атрымоўвае «чацвёрку». За Лапкоўскай «добра» атрымоўвае і В. Васілец. Далей здараецца зусім недарэчнае. Адна за адной выходзяць з аўдыторыі А. Дабрыян І. Л. Камашэнкава. Адна і другая нават і адказваць не пачыналі. Адна і другая нічога не ведалі. Але рэакцыя да такое здарэнне ў іх зусім розная. Дабрыян не магла стрымаць слёзы, а Камашэнкава нават не палічыла патрэбным схаваць сваю пастаянную ўсмешку, такую недарэчную ў такі момант. «Двойка» і ўсмешка — вось дык суседства на экзамене!

В. НАЛІМАЎ.



*

На здымку:
Хімічны факультэт. Звычайны малюнак. У адной з лабараторый ідзе падрыхтоўка да чарговага экзамена. Лепшая праверка ведаў — эксперымент.

*

### СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ

*У мінулым нумары мы апублікавалі пісьмо дэкана заатэхнічнага факультэта БСГА Івана Фядотавіча Някрашэвіча пра брата Канстанціна, які загінуў на подступах да Гомеля. Два дні назад атрымана другое пісьмо ад І. Ф. Някрашэвіча, дзе ён шчыра дзякуе за ўвагу, з якой аднесліся камітэт камсамола і рэдакцыя да лёсу яго брата, былога студэнта геаграфічнага факультэта.*

***Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў***

## Узнагарода за мужнасць

У АРХІВЕ рэдакцыі ёсць пісьмо, якое расказвае пра подзвіг былога партызана, які адразу пасля вайны паступіў вучыцца на фізмат нашага універсітэта. Зараз ён працуе ў якасці дацэнта на кафедры эксперыментальнай фізікі і электронікі. Яго прозвішча Іван Іванавіч Пятроўскі.

Гэта было ў адну з вясенніх начэй 1943 года, глыбока ў тыле ворага, у лясах Міншчыны, дзе дзейнічала партызанская брыгада «Полымя». За два кіламетры ад партызанскага лагера, у вёсцы, размясціўся нямецкі гарнізон колькасцю ў 250—300 чалавек. Гэты гарнізон неабходна было разграміць, бо ён знаходзіўся на шляху да камунікацый ворага і затрымліваў дыверсійныя дзеянні партызан.

Для праведзення аперацыі камандаванне вылучыла тры ўзводы, адным з якіх камандаваў Іван Пятроўскі. Ноччу паўзком партызаны дабраліся да вясковых могілак, ад якіх было метраў трыста да самой вёскі. Нішто не парушала начную цішыню. Трэба было як мага бліжэй падыйсці да ворага, не адкрываючы агню. Каманды перадаваліся шэптам.

Пасланая на могілкі разведка вярнулася, не знайшоўшы там немцаў. Узвод заняў могілкі. Агнявая падрыхтоўка цягнулася паўгадзіны, і затым Пятроўскі павёў свой узвод наперад. Але ён адарваўся ад іншых узводаў, якія пад агнём праціўніка павінны былі залегчы. Вынік аперацыі залежыў ад знаходлівасці камандзіра і яго ўмення ацаніць абстаноўку, а таксама ад кемлівасці і мужнасці ўсіх партызан.

Да вёскі заставалася метраў 50. Загадаўшы сваім байцам ісці ўслед за ім, Пятроўскі з яшчэ адным партызанам папоўз да дзотаў і казармаў. За некалькі хвілін казармы і дзоты былі закіданы гранатамі. Партызаны кінуліся ў атаку. (Напарнік І. Пятроўскага па подзвігу, Уладзімір Малышаў, цяпер працуе дырэктарам 8-гадовай школы ў Пухавіцкім раёне. — Рэд.).

Немцы замітусіліся. А ў гэты час з другога боку ў вёску ўварваліся другі і трэці ўзводы. Да раніцы ўсё скончылася. Варожы гарнізон быў знішчаны, партызаны захапілі багатыя трафеі.

Баявая задача была паспяхова выканана. За яе правядзенне І. І. Пятроўскі і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

## Дзякуй шэфам!

Партыйны камітэт Мінскага аўтамабільнага завода выказвае глыбокую ўдзячнасць усім навуковым работнікам, аспірантам БДУ імя У. І. Леніна, якія выступілі з лекцыямі, дакладамі і гутаркамі ў цэхах і аддзелах нашага шматтысячнага калектыву.

Выступленні навуковых супрацоўнікаў універсітэта аказваюць нам неацэнную дапамогу ў ідэйным выхаванні рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, дапамагаюць узняць агульны ўзровень ведаў сярод аўтазаводцаў.

У гэтай высакароднай рабоце асабліва актыўна ўдзельнічаюць кафедры рускай і беларускай літаратуры, якія сістэматычна праводзяць у нас «Дні літаратурных чытанняў», выязджаюць да нас амаль поўным складам кафедраў адначасова. Да нас часта прыязджаюць прафесары Л. І. Фіглоўская, М. Р. Ларчанка, дацэнты Н. І. Лапідус, З. С. Мялкіх, Л. Е. Цімашкова, Н. В. Галаўко, О. В. Казлова, Н. С. Гілевіч, У. С. Карабан, Л. Л. Кароткая, І. Л. Парашкова, Н. Н. Рамашка, І. Т. Ішчанка, Е. Л. Бондарава, А. А. Лойка, В. А. Захарава, С. А. Лысенка, а таксама загадчык кафедры друку дацэнт Р. В. Булацкі, дацэнт М. С. Зярніцкі, выкладчык А. Н. Пётух, аспіранты А. Малінін, П. Купрэенка, В. Рагойша, прадстаўнікі іншых кафедраў і факультэтаў універсітэта прафесары В. Г. Заўрыеў, Г. Г. Вінберг, дацэнты і кандыдаты навук В. А. Навіцкі, Б. Ф. Осіпаў, А. Х. Шкляр, М. Я. Рэзнікаў, Э. М. Загарульскі, а таксама многія выкладчыкі і аспіранты.

Вялікую ўвагу і клопаты ў правядзенні гэтай работы праяўляюць старшыня ўніверсітэцкай групы таварыства «Веды» М. Я. Рэзнікаў і член бюро групы кандыдат юрыдычных навук В. В. Сарокіна.

У гэтыя дні калектыў нашага завода рыхтуецца адзначыць 20-годдзе прадпрыемства. Разам з намі будзе святкаваць уся рэспубліка. Можна з упэўненасцю сказаць, што сваёй шэфскай дапамогай універсітэт унёс вялікую долю працы ў выхаванне калектыву завода. Мы верым, што наша ўзаемная сувязь будзе мацнець і прымаць усё больш разнастайныя і больш шырокія формы.

В. ЧАЙКОЎСКІ,
сакратар парткома Мінскага аўтазавода.

## Віншуем Вас, Алена Паўлаўна!



Дацэнту кафедры педагогікі і псіхалогіі Алене Паўлаўне Ерась споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння і 40 гадоў яе навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

Жыццёвы і працоўны шлях Алены Паўлаўны падобны шляху моладзі яе пакалення, які склаўся пад жыватворным уплывам падзей Кастрычніка і будаўніцтва маладой сацыялістычнай дзяржавы. Яна, як і пераважная большасць моладзі таго часу, актыўна адгукнулася на заклік партыі—вучыцца, будаваць і ўмацоўваць першую ў свеце савецкую дзяржаву.

Нарадзілася Алена Паўлаўна ў 1904 годзе ў сям'і дробнага служачага ў в. Зямлянцы Глухаўскага раёна Сумскай вобласці. У 1920 годзе, пасля заканчэння пяці класаў Глухаўскай жаночай гімназіі, Алена Паўлаўна паступіла ў сацыяльна-эканамічную прафесіянальную школу, а праз тры гады — у Нежынскі інстытут народнай асветы. Пасля заканчэння яго Алена Паўлаўна працуе чатыры гады — спачатку настаўніцай, а потым інспектарам РАНА.

У 1931 годзе Алена Паўлаўна Ерась па закліку партыі добраахвотна паехала на будаўніцтва гіганта першай пяцігодкі — Магнітагорскага металургічнага камбіната, дзе тры гады працавала загадчыцай метадычнага кабінета і вучэбна-метадычнага сектара аддзела кадраў будаўніцтва. Кіраўніцтва камбіната камандзіравала Алену Паўлаўну на вучобу ў аспірантуру па спецыяльнасці псіхалогія ў Маскоўскі педагагічны інстытут.

Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі Алена Паўлаўна працавала спачатку асістэнтам, а потым дацэнтам Маскоўскага педінстытута імя У. І. Леніна, а з 1941 па 1944 год — дацэнтам Ніжнетагільскага настаўніцкага інстытута.

У першыя ж дні вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Алена Паўлаўна Ерась, па запрашэнню органаў асветы нашай рэспублікі, прыехала ў Мінск і была прызначана на работу ў якасці дацэнта універсітэта.

Усе апошнія 20 гадоў Алена Паўлаўна плённа вядзе педагагічную, навукова-даследчую і грамадска-палітычную работу ў БДУ імя У. І. Леніна. Лекцыі яе карыстаюцца ўсеагульнай павагай і выклікаюць вялікую зацікаўленасць у студэнтаў. Алена Паўлаўна напісала і апублікавала больш за 20 навукова-даследчых прац па найбольш актуальных праблемах псіхалогіі. Яна з'яўляецца адным з вядучых аўтараў падручніка «Псіхалогія» для студэнтаў-завочнікаў вну, які рыхтуецца зараз выдавецтвам «Вышэйшая школа».

На працягу 14 гадоў Алена Паўлаўна Ерась з'яўляецца дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. Яна з'яўляецца старшынёй арганізацыйнага камітэта рэспубліканскага таварыства псіхолагаў, членам бюро педагагічнай секцыі праўлення рэспубліканскага таварыства «Веды», актыўна прапагандуе педагагічныя веды сярод насельніцтва.

Алена Паўлаўна Ерась узнагароджана ордэнам «Знак пашаны», двума медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР і Граматай рэктарата БДУ імя У. І. Леніна.

У дзень шасцідзесяцігоддзя Алены Паўлаўны Ерась мы жадаем ёй моцнага здароўя і вялікіх поспехаў у педагагічнай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай дзейнасці.

Калектыў кафедры педагогікі і псіхалогіі БДУ.

